**УДК 81'373.72**

# ПРЫМЕТНІКАВЫЯ ФРАЗЕАЛАГІЗМЫ СА СТРУКТУРАЙ СЛОВАЗЛУЧЭННЯ, НЕ АДПАВЕДНАЙ ІХ КАТЭГАРЫЯЛЬНАМУ ЗНАЧЭННЮ, У БЕЛАРУСКІХ ГАВОРКАХ

***І.Т. ЯЎГЕНІДЗЭ***
***(Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы)***
***evgenidze_it@grsu.by***

*Артыкул прысвечаны праблеме даследавання структурных тыпаў і мадэляў фразеалагізмаў са структурай словазлучэння, якая не адпавядае іх катэгарыяльнаму значэнню. Актуальнасць дадзенага пытання абумоўлена адсутнасцю сістэмнага даследавання структуры прыметнікавых фразеалагізмаў беларускай дыялектнай мовы. Матэрыялам даследавання паслужыў 241 фразеалагізм, выбраны з фразеалагічных і лексічных слоўнікаў беларускіх гаворак. Ва ўводзінах разглядаецца метад мадэлявання, яго прымяненне ў мовазнаўстве, раскрываецца паняцце "лінгвістычная мадэль". У асноўнай частцы праводзіцца падзел адзначаных фразеалагізмаў паводле марфалагічнага выражэння галоўнага кампанента на тры структурныя групы: з галоўным кампанентам назоўнікам, дзеясловам і лічэбнікам. Кожная з іх аб'ядноўвае шэраг структурных тыпаў і мадэляў рознай ступені прадуктыўнасці. Выяўленыя структурныя схемы суправаджаюцца ілюстрацыйнымі прыкладамі. Прыведзены дакладныя колькасныя падлікі зафіксаваных фразеалагізмаў. У заключэнні зроблены вывад аб ступені прадуктыўнасці выяўленых структурных тыпаў і мадэляў даследаваных фразеалагізмаў.*

***Ключавыя словы:*** *дыялектная фразеалогія, прыметнікавы фразеалагізм, мадэляванне, фразеалагічная мадэль, структурны тып, прадуктыўнасць мадэлі.*

**Уводзіны.** Адным з агульнанавуковых, міждысцыплінарных метадаў даследавання з'яўляецца мадэляванне – «выяўленне ўласцівасцей якога-небудзь прадмета пры дапамозе пабудовы яго мадэлі» [1, с. 41]. Першапачаткова дадзены метад выкарыстоўваўся толькі ў дакладных навуках (матэматыцы, хіміі, фізіцы і інш.). На мяжы 30-х – 40-х гг. XX ст. у выніку развіцця вучэння аб мове як структуры ўзнік асобны кірунак мовазнаўства – структурная лінгвістыка. Даследаванне структуры мовы патрабуе адпаведных метадаў, асноўным з якіх выступае мадэляванне. У мовазнаўстве яго разумеюць як «метад, пры якім даследчык зыходзіць з некаторых найбольш агульных рысаў пэўных моваў, фармулюе некаторыя гіпотэзы аб будове мовы як абстрактнай семіятычнай сістэмы, а затым вызначае, у якіх адносінах знаходзяцца вынікі гэтых гіпотэз і факты рэальных моваў, што апісваюцца канкрэтнымі лінгвістычнымі дысцыплінамі» [2, с. 8]. «З. Харыс, амерыканскі лінгвіст, прадстаўнік структурнага кірунку, быў першым, хто выкарыстаў тэрмін "мадэль" у мовазнаўстве» [3, с. 151]. Паняцце «лінгвістычная мадэль» атрымала шырокае распаўсюджанне ў 60-я – 70-я гг. XX ст. «з узнікненнем матэматычнай лінгвістыкі і пранікненнем у лінгвістыку матэматычных метадаў» [1, с. 41]. Мадэль у лінгвістыцы – гэта «штучна створаная лінгвістам рэальная або ўяўная канструкцыя, што ўзнаўляе, імітуе сваімі паводзінамі (звычайна ў спрошчаным выглядзе) паводзіны арыгінала ў лінгвістычных мэтах» [1, с. 41]. Выяўленне мадэляў адбываецца паводле сродкаў пазнання і эксперыменту. Паколькі ў працэсе функцыянавання мовы эксперыменты амаль немагчымыя, то, па словах Л.М. Засорынай, асобая роля ў гуманітарных навуках належыць абстрактным (логіка-матэматычным) мадэлям і эксперыментам мыслення. У мовазнаўстве «мадэляванне зводзіцца да шэрагу абстрактных схемаў, болей або меней набліжаных да арыгінала» [4, с. 255].

У фразеалогіі мадэляванне выступае важным спосабам утварэння новых адзінак, якія ствараюцца паводле ўжо вядомых структурных схем. «Пад фразеалагічнай мадэллю разумеецца структурна-семантычны інварыянт, які мае пэўную сінтаксічную канструкцыю і адносна стабільную семантыку» [5, с. 210].

Мэта дадзенага даследавання – выяўленне структурных асаблівасцей прыметнікавых фразеалагізмаў беларускіх гаворак са структурай словазлучэння. Згадаем, што адзначаныя фразеалагізмы паводле марфалагічнага выражэння галоўнага кампанента падзяляюцца на адпаведныя і не адпаведныя свайму катэгарыяльнаму значэнню. Да першых адносяцца фразеалагізмы, «катэгарыяльнае значэнне якіх сігналізуецца атрыбутыўным кампанентам (прыметнікам, дзеепрыметнікам, займеннікам, парадкавым лічэбнікам)» [6, с. 113], напрыклад: *лёгкі на пад'ём, як расолам умыты, сам у сабе (сябе)*. Да другіх належаць адзінкі, што «пазбаўлены знешніх марфалагічных прымет сваёй катэгорыі» [7, с. 42]. У склад ад'ектыўных такія фразеалагізмы ўключаюцца паводле іх семантычных і сінтаксічных паказчыкаў. Вылучаюцца выразы з граматычна галоўным кампанентам назоўнікам, лічэбнікам, дзеясловам: *з другога цеста, два метры сухастою, вочы коле.*

Прыметнікавыя фразеалагізмы беларускіх гаворак са структурай словазлучэння, адпаведнай катэгарыяльнаму значэнню, ужо намі разглядаліся. Задача дадзенага даследавання – выявіць і прааналізаваць структурныя тыпы і мадэлі прыметнікавых фразеалагізмаў беларускай дыялектнай мовы, фармальна не адпаведных свайму катэгарыяльнаму значэнню, якія паводле структуры суадносяцца са словазлучэннем.

**Асноўная частка.** Фразеалагізмы са структурай, не адпаведнай іх катэгарыяльнаму значэнню, у беларускіх гаворках вызначаюцца значнай колькасцю адзінак – 241 фразеалагізм, выяўлены ў фразеалагічных і лексічных слоўніках беларускай дыялектнай мовы. Яны ў сваёй большасці з'яўляюцца нязменнымі, не маюць парадыгматычных форм. У сказе выконваюць сінтаксічную функцыю недапасаванага азначэння ці іменнага выказніка. Паводле марфалагічнага выражэння граматычна галоўнага кампанента яны падзяляюцца на тры групы. У **першую** ўваходзяць 108 прыметнікавых фразеалагізмаў са стрыжнёвым кампанентам назоўнікам. Да яе належаць наступныя структурныя тыпы.

Першы тып аб'ядноўвае трохкампанентныя фразеалагізмы са структурай «прыметнік (займеннік, лічэбнік) + назоўнік з прыназоўнікам ці без яго» (62 выразы). У яго межах вылучаецца пяць прадуктыўных мадэляў і чатыры непрадуктыўныя:

1) «лічэбнік (займеннік) + назоўнік у назоўным склоне»: *адна кожа, адно гора, адны косці, самый сок*;

2) «прыметнік (лічэбнік, займеннік) + назоўнік у родным склоне»: *малога боку, першай клясы, нашага племя, первай маркі, першай стрэчы, свае гадоўлі, сярэдняй рукі*;

3) «прыназоўнік *на* + прыметнік (займеннік, лічэбнік) + назоўнік у месным склоне»: *на белым кані, на курачай назе, на сваіх нагах, на сёмым небе, на ўсіх нагах*;

4) «прыназоўнік *з* + прыметнік (лічэбнік, займеннік) + назоўнік у родным склоне»: *з гарачага лесу, з другога цеста, з макава зярэнца, з храбрага дзясятка, з усяго (цэлага) свету*;

5) «назоўнік у давальным склоне + прыназоўнік *па* + назоўнік у вінавальным склоне»: *вераб'ю па калена, свінні па калена, курыцы па калена, жабі па калено,* кавалер *кату па каўнер,* кавалер *свінні па каўнер, кату па калена, кату па пяту, пеўню па костачку, мурашцы па калена*;

6) «прыназоўнік *на* + лічэбнік (займеннік) + назоўнік у вінавальным склоне»: *на адзін твар, на адзін капыл, на адну калодку, на адну масць, на ўвесь кант, на ўсе рукі* майстар, *на ўсе штукі,* пані *на ўсе сані*;

7) «прыназоўнік *у* + лічэбнік (прыметнік) + назоўнік у месным склоне»: *у трэцім пакаленні, у другой стрэчы, у першай стрыі, у вялікіх гадах*;

8) «прыназоўнік *з* + назоўнік у творным склоне + прыназоўнік *у* + назоўнік у месным склоне»: *з ветрам (мухамі) у галаве, з мухамі ў носе*;

9) «назоўнік у назоўным склоне + прыназоўнік *з* + назоўнік у творным склоне»: *кроў з малаком, мёд з малаком.*

15 фразеалагізмаў дадзенага тыпу ўтвораны паводле непрадуктыўных мадэляў: *у самый раз, зроблены з адной мукі, з пекла родам, адным словам, без цара ў галаве, да самага неба,* дзяла *як сажа бяла, з камарыны нос, з чорным паднябеннем, з-пад цёмнай гвязды* гультай, *курам на смех, на вес золата, сабе на ўме, без фігі ні да носа, з галавою на плячах.*

У другі тып уваходзяць фразеалагізмы з пачатковым злучнікам *як (што)* (38 адзінак). Сярод іх назіраецца адна прадуктыўная структурная мадэль і чатыры малапрадуктыўныя:

1) «злучнік *як (што)* + прыметнік (займеннік) + назоўнік у назоўным склоне»: *як (што) вострый нож, як (што) макаў цвет, як воўча вока, як карова ляндэрская (рандэльская), як клышні ракавыя, як конь стаенны, як кот благі, як кот лядачы, як мышыныя хвасты (хвосцікі), як палескі злодзей, як новы рубель (новая капейка), як панскі цюцька, як рудая мыш, як саламонавы гаці, як свет велькі, як тая скобля, як цёмная ноч, як збродлівы кот, як старыя рэзгіны*;

2) «злучнік *як* + дзеепрыметнік + назоўнік у назоўным склоне»: *як збянтэжаны Саўка, як печаны рак* смак;

3) «злучнік *як* + прыназоўнік *у* + назоўнік у месным склоне + назоўнік у назоўным склоне»: *як у мосце дзірка, як у рэшаце вада, як кол у плоці*;

4) «злучнік *як* + прыназоўнік *з* + прыметнік + назоўнік у родным склоне»: *як з блакаднага Ленінграду, як з вырванскай вуліцы*;

5) «злучнік *як* + назоўнік у назоўным склоне + прыназоўнік *да* + назоўнік у родным склоне»: цікавы *як Марцін да кавы, як мядзведзь да танцаў.*

10 фразеалагізмаў дадзенага тыпу ўтвораны паводле непрадуктыўных мадэляў: харошы *як люлька за тры грошы, як ад пустога дому закрутка, як для (да) роднага бацькі* нож, *як кятурка старога дзеда, як лёд на (каля) Пятра, як Манька з батонамі, як мёртвага ногі, як у вока пальцам, як у палескага злодзея, як чорт з балота.*

Трэці тып аб'ядноўвае фразеалагізмы з часціцай *не (ні, ані)* у сваім складзе (8 адзінак). У яго межах вылучаецца адна прадуктыўная мадэль «часціца *не (ні, ані)* + прыметнік (займеннік, лічэбнік) + назоўнік у родным склоне»: *не нашай гадоўлі, не нашого бога* чалавек, *не первай маладосці, не робкага дзясятка, ні рубіначкі сухой.* Акрамя таго, 3 фразеалагізмы ўтвораны паводле непрадуктыўных мадэляў: *не з храбрага дзясятка, не твайму носу палосу, ні (ані) да зімнай вады.*

**Другую групу** фразеалагізмаў, не адпаведных катэгарыяльнаму значэнню, складаюць адзінкі з граматычна галоўным кампанентам, выражаным дзеясловам, які застыў у пэўнай граматычнай форме (123 фразеалагізмы). Паміж кампанентамі фразеалагізма назіраецца сувязь, адпаведная кіраванню: стрыжнёвы дзеяслоў фармальна кіруе залежным ад яго назоўнікам. Усе адзінкі дадзенага тыпу ў залежнасці ад граматычнай формы галоўнага кампанента можна падзяліць на чатыры тыпы.

Першы тып аб’ядноўвае фразеалагізмы з галоўным кампанентам дзеясловам цяперашняга часу (45 адзінак). Тут назіраюцца дзве прадуктыўныя і восем малапрадуктыўных структурных мадэляў:

1) «назоўнік у вінавальным склоне + дзеяслоў»: *вочы коле, люльку кýрыць, Маскву відаць (відно), мае галаву, мае язык, цара <гароха> помніць*;

2) «назоўнік у вінавальным склоне + дзеяслоў з часціцай *не (ня)*»: *лыка не вяжа, ніткі не рве, ня мае сэрца, саломку не пераламае, слова не жуе*;

3) «дзеяслоў + прыназоўнік *у* + назоўнік у месным склоне»: *растае ў роце, расце ў роце*;

4) «назоўнік у родным склоне + дзеяслоў з часціцай *не (ні)*»: *віду не мае, голасу ні мая*;

5) «назоўнік у вінавальным склоне + прыметнік (займеннік) + дзеяслоў»: *вочы чорныя мая, усе артыкулы знае*;

6) «назоўнік у родным склоне + прыметнік + дзеяслоў з часціцай *не*»: *граша меднага (ломанага) не стоіць, свету боскага не відаць*;

7) «інфінітыў + дзеяслоў»: *есці просяць, піць хочуць*;

8) «назоўнік у родным склоне + дзеяслоў»: *ветру баіцца, просяць кашы*;

9) «прыназоўнік *праз* + назоўнік у вінавальным склоне + дзеяслоў»: *праз кулакі відзіць, праз раз дыхае*;

10) «прыназоўнік *на* + назоўнік у месным склоне + назоўнік у вінавальным склоне + дзеяслоў»: *на хаду падэшвы рэжа, носіць ключы на пупе.*

Паводле непрадуктыўных мадэляў утвораны 18 фразеалагізмаў: *ні граша (капейкі) не стоіць (не варты), ад (з) ветру вáліцца, адною рукою есць, ведая ўсе хады і выхады, з галавой не дружыць, з небам гаворыць (гаворáць), з матам есці сядае, не за валамі ходзіць, нос высока нясе, у адных лапцях ходзяць, у шкуры не змяшчаецца, шкуры на сабе не чуе, які (якая, якое, якую) хочаш, на вадзе заводзіцца, на розум не хварэе, у падмётķі не гадзіцца, ад зямлі ня відна (чуць відна), уморы не знае.*

Да другога тыпу належаць фразеалагізмы з галоўным кампанентам дзеясловам у форме прошлага часу закончанага трывання (30 адзінак). У межах дадзенага тыпу назіраюцца дзве прадуктыўныя структурныя мадэлі і тры малапрадуктыўныя:

1) «прыназоўнік *з* + назоўнік у родным склоне + дзеяслоў»: *з Бялавічаў уцёк, з галанкі ляснуўся, з дуба ўпаў (зваліўся), з Мэштавіч уцёк, з пня зваліўся, з неба зваліўся*;

2) «назоўнік у вінавальным склоне + дзеяслоў»: *зубы вышчарыў (вышчырыў), забраў крышкі, мяла (качалку) аблізаў, крошачкі пазбіраў (пабраў), крышкі пабраў (забраў), таленты пабраў*;

3) «прыназоўнік *у* + назоўнік у месным склоне + дзеяслоў»: *у сарочцы нарадзіўся, у лесе нарадзіўся, у пушчы (лесе) вырас, у чапцэ нарадзіўся*;

4) «прыназоўнік *ад* + назоўнік у родным склоне + дзеяслоў з часціцай *не*»: *ад гаршка не адрос, ад жабы не адрос, ад зямлі не адрос*;

5) «прыназоўнік *з* + назоўнік у творным склоне + дзеяслоў»: *з свіньмі еў, з чортам папалявала, з вальтамі пасварыўся.*

8 фразеалагізмаў утвораны паводле непрадуктыўных мадэляў: *блёкату аб’еўся, з сямі печаў хлеб еў, з чортам у адной лазні памыўся, і мерачкі пабраў, у бога цяля ўкраў, чыста свіную акадэмію скончыў, як з вока выпаў, як з таго свету ўстаў (-ла, -лі).*

Трэці тып утвараюць фразеалагізмы з галоўным кампанентам дзеясловам будучага часу (37 адзінак). Яны пабудаваны паводле адной прадуктыўнай і трох малапрадуктыўных мадэляў:

1) «назоўнік у родным склоне + дзеяслоў з часціцай *не (ні)*»: *курыцы (пеўня) не пакрыўдзіць (не выб’е), мухі не зачэпіць, камара ні заб’е, мухі не пакрыўдзіць, вады <ў лыжцы> не замуціць*;

2) «прыназоўнік *з-пад* + назоўнік у родным склоне + назоўнік у вінавальным склоне + дзеяслоў»: *з-пад сучкі яйцо ўкрадзе, з-пад гадзіны (гадзюкі, гада, яшчаркі) яйкі (яйка) выбера (выме, выхапіць, дастане), з-пад жабы яйкі выме, з-пад каня падковы адарве*;

3) «прыназоўнік *за* + назоўнік у вінавальным склоне + назоўнік у вінавальным склоне + прыназоўнік *да* + назоўнік у родным склоне + дзеяслоў»: *за капейку вош да бярозы завядзе, за капейку вош (блыху) да Масквы (у Маскву) пагоніць (папрэ).*

26 фразеалагізмаў утвораны паводле непрадуктыўных мадэляў: *<адным> арэхам падзеліцца, ад яйка адалье, без рубля не чхне, воко не запарушыць, двух слоў ні звяжа, з ветру вяроўкі саўе, за грош у Маскву збегае, за дваццаць капеек вераб’я па полі заганяе, за капейку (рубель) і бацьку роднага прадасць, за капейку (рубель) павесіцца, за словом у кішэню ні палезя, за так жонку ні пацалуя, зімою снегу не дасць, і чарта пройдзіць, на вялікдзянь ні засмяецца, на коляды снегу не пазычыць, на лёдзе ўгрэецца, на хаду падмёткі адарве <і прыб’е>, нічога ні скажаш, нэ дасць собіе в кашу дмухаті, пальцам не зачэпіць (не зачапіў, не крануў)* каго, *сякеру можа з’есці, у касцелі на акне дастане, у нішчага торбу выпрасіць і с кускамі, у хату не ўлезя, усіх сабак перабрэша.*

Чацвёрты тып прадстаўлены фразеалагізмамі, галоўны кампанент якіх мае форму інфінітыва (10 адзінак). Яны арганізаваны паводле дзвюх малапрадуктыўных мадэляў:

1) «злучнік *як* + назоўнік у творным склоне + інфінітыў»: *як вокам (ек поленом) скінуць, як касой сцягнуць*;

2) «прыназоўнік *на* + назоўнік у вінавальным склоне + інфінітыў»: *на нос адзяваць, на раз аблізаць.*

Астатнія адзінкі пабудаваны паводле непрадуктыўных структурных схем: *вачэй не адарваць, курыцы напіцца, чуць падняць, як <старой> бабе сесці, сабакі не выгнаць з двара, з-пад ногця (з-пад пазура, з-пад кіпця) гразі не дастаць (не дасць, не дастане).*

Акрамя таго, адзін фразеалагізм мае ў сваім складзе граматычна галоўны дзеяслоў загаднага ладу: *што на нітку чапай.*

**Трэцяя група** аб'ядноўвае прыметнікавыя фразеалагізмы з галоўным кампанентам лічэбнікам (10 адзінак). Яны ўтвораны паводле малапрадуктыўнай мадэлі «прыназоўнік *на* + лічэбнік + назоўнік у родным склоне»: *на сто процантаў (працэнтаў), на тры полкі.* Восем адзінак утвораны па непрадуктыўных мадэлях: жывот *у сем столак (тры столкі), адзін (адна, адно) як вока ў лобе, два метры сухастою, кругом дваццаць пяць, кругом на сто, два мэтры і ўсё ногі, сямі пядзей ва лбу (лбе), тры чвэрці да смерці (тры чвэрткі да смерткі).*

**Заключэнне.** Такім чынам, прыметнікавыя фразеалагізмы беларускіх гаворак са структурай словазлучэння, не адпаведнай катэгарыяльнаму значэнню, у залежнасці ад марфалагічнага выражэння граматычна галоўнага кампанента падзяляюцца на тры групы: з галоўным кампанентам назоўнікам, дзеясловам і лічэбнікам. Найбольшая колькасць прадуктыўных структурных схем характэрна для фразеалагізмаў з галоўным кампанентам назоўнікам. У межах дадзенага тыпу сустракаецца і самая шматлікая структурная схема «злучнік *як (што)* + прыметнік (займеннік) + назоўнік у назоўным склоне», паводле якой арганізаваны 19 фразеалагізмаў. Найбольшай колькасцю адзінак вызначаецца структурны тып з галоўным кампанентам дзеясловам – 123 адзінкі – гэта больш за палову ад агульнай колькасці прыметнікавых фразеалагізмаў адзначанай структуры. Найменшую колькасць адзінак аб'ядноўвае трэці тып. Толькі ў 10 выразах галоўным кампанентам з'яўляецца лічэбнік. Структура такіх фразеалагізмаў досыць разнастайная, прадстаўлена ў асноўным малапрадуктыўнымі або непрадуктыўнымі структурнымі мадэлямі.

ЛІТАРАТУРА


1. Дорофеева, И. В. Общенаучный метод моделирования и специфика его применения в лингвистике / И. В. Дорофеева // Вестн. Моск. ин-та лингвистики. – 2015. – № 9 (9). – С. 40–45.
2. Ревзин, И. И. Модели языка / И. И. Ревзин. – М. : РИСО-АН СССР, 1962. – 192 с.
3. Лашук, Дз. А. Структурна-семантычныя мадэлі дыялектных субстантыўных фразеалагізмаў з адмоўным значэннем у адносінах да чалавека / Дз. А. Лашук // Мова і літаратура ў XXI ст.: актуальныя аспекты даследавання : матэрыялы II Рэспубл. навук.-практ. канф. маладых вучоных, 22 сакавіка 2013 г. / Белар. Дзярж. ун-т ; рэдкал.: П. І. Навойчык (адказ. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2013. – С. 151–154.
4. Засорина, Л. Н. Введение в структурную лингвистику : учеб пособие для студентов филологических специальностей ун-тов / Л. Н. Засорина. – М. : Высшая школа, 1974 – С. 319.
5. Даніловіч, М. А. Фразеалагізмы традыцыйных мадэляў у беларускай дыялектнай мове / М. А. Даніловіч // Е. Ф. Карский и современное языкознание : материалы XII междунар. науч. чтений, 20–21 мая 2010 г. / Гродн. гос. ун-т им. Я. Купалы ; редкол.: М. И. Конюшкевич (гл. ред) [и др.]. – Гродно, 2011. – С. 210–217.
6. Лепешаў, І. Я. Фразеалогія сучаснай беларускай мовы : вучэб. дапам. для філал. фак. ВНУ / І. Я. Лепешаў. – Мінск : Вышэйшая школа, 1998. – 271 с.
7. Бурлыка, С. І. Тыпы прыметнікавых фразеалагізмаў са структурай словазлучэння / С. І. Бурлыка // Весн. ГрДУ ім. Янкі Купалы. Сер. 3, Філалогія. Педагогіка. – 2006. – № 4. – С. 40–44.


*Пастyпiў 16.04.2019*

## ADJECTIVAL IDIOMS WITH THE WORD COLLOCATION STRUCTURE THAT IS INCONSISTENT WITH THEIR CATEGORICAL MEANING IN BELARUSSIAN DIALECTS

***I. YAUHENIDZE***

*The article covers the problem of structural types and models of idioms with word collocation structure that is inconsistent with their categorical meaning. The relevance of this topic is determined by absence of system research of adjectival idioms' structure on the base of Belarussian dialect. The data for study were 225 idioms which were selected from phraseological and lexical dictionaries of Belarussian dialects. In introduction the method of modelling and its application in linguistics is considered, the concept of linguistic model is clarified. The division of mentioned idioms into three structural groups according to morphological expression: with a noun, verb and numeral as the main component was made in the main part of the article. Each of these structural groups unites a number of structural types and models of different productivity. Structural schemes discovered are accompanied by illustrative examples. Precise quantitative calculations of recorded idioms were made. In the end of the article the conclusion about productivity of identified structural types and models was made.*

***Keywords:*** *dialect phraseology, adjectival idiom, modelling, phraseological model, structural type, model productivity.*